УДК 7.077(476)

**Е. А. Макарова**
/ Рэспубліка Білорусь /

# АМАТАРСКАЯ МАСТАЦКАЯ ТВОРЧАСЦЬ У СТРУКТУРЫ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ

Аматарская мастацкая творчасць як сацыяльна-культурны феномен з'яўляецца прадметам вывучэння культуралогіі, сацыялогіі, псіхалогіі, педагогікі, мастацтвазнаўства і тэорыі сацыяльна - культурнай дзейнасці. Гэта тлумачыцца тым, што, як з'ява мастацкай культуры і пласт народнай мастацкай творчасці, аматарская мастацкая творчасць выступае ў якасці дзейснага фактару сацыякультурнай дынамікі і эфектыўнага сродку праяўлення сацыягенных патраб асобы і яе этнічнай самабытнасці.

Аматарская мастацкая творчасць у Беларусі – форма праяўлення сацыяльна-культурнай актыўнасці насельніцтва ў сферы мастацтва. Яна ўключае ў сябе розныя віды аматарскай мастацкай творчасці, дзіцячую і сямейную мастацкую творчасць, студэнцкую самадзейнасць, мастацкую творчасць аматарскіх калектываў і асобных выканаўцаў, практыку функцыянавання аматарскіх мастацкіх аб'яднанняў і гурткоў па захапленнях, сацыяльна-культурныя ініцыятывы ў галіне мастацкай культуры і інш.

Як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу аматарская мастацкая творчасць не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Пацвярджэннем значнай сацыяльнай ролі аматарскіх мастацкіх калектываў у культурным жыцці рэгіёнаў Беларусі з'яўляюцца шматлікія фестывалі, агляды-конкурсы, святы народнага мастацтва, якія дэманструюць творчыя дасягненні мастацкіх аматарскіх калектываў і асобных выканаўцаў.

Практыка сведчыць, што аматарская мастацкая творчасць была і застаецца адной з найбольш актыўных формаў мастацкага асэнсавання рэчаіснасці. Як кожная з'ява культуры, аматарскае мастацтва – вельмі мнагамерны, шматузроўневы сацыяльны арганізм. У розных рэгіёнах краіны існуе значная колькасць такіх мастацкіх фарміраванняў, якія сваёй творчай працай уносяць значны ўклад у нацыянальную культурную скарбонку, садзейнічыюць фарміраванню нацыянальнай культуры праз прапаганду каштоўнасцей гэтай скарбонкі усімі даступнымі ёй формамі і метадамі.

Вытокі аматарскай мастацкай творчасці ляжаць у народных звычаях і каляндарных абрадах, грамадскіх формах выкарыстання вольнага часу, звязаных з песеннай, інструментальнай, тэатральнай і вусна-паэтычнай творчасцю, гульнявымі зносінамі, сямейнымі і святочна – абрадавымі традыцыямі. Нельга не адзначыць, што ўзнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай беларускай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, аматарская мастацкая творчасць выступае ў якасці самастойнай падсістэмы сацыялізацыі асобы, сацыяльнага выхавання і адукацыі. Яна з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўным сродкам самарэалізацыі творчых здольнасцей асобы, яе самапраяўлення і самавызначэння; выступае дзейсным механізмам эстэтычнага развіцця асобы, забяспечвае змястоўную арганізацыю вольнага часу аматараў мастацтва.

Даследваніі, якія праводзіліся намі ў складзе групы супрацоўнікаў Установы культуры «Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці на працягу апошніх
20 год на Міншчыне (22 раёны) дазваляюць сцвярджаць, што вяртанне да культурна-гістарычных традыцый – адзін з найбольш актыўных сацыяльна-культурных
працэсаў, што адбываецца зараз у аматарскай мастацкай творчасці.

Творчыя намаганні аматарскіх мастацкіх калектываў характарызуецца, у першую чаргу, зваротам да традыцыйнай мастацкай культуры. Так, аналіз практыкі функцыянавання калектываў Мінскай вобласці дае падставу для меркаванняў, што рух аматарскай творчасці – асаблівая і вельмі цікавая з'ява беларускай культуры. Ён адчувае на сабе сацыяльна-гістарычныя ўплывы, якія перажываў беларускі народ на розных этапах сваёй гісторыі.

Па сутнасці з'яўляючыся працягам масавай аматарскай самадзейнасці савецкага часу, сучасная аматарская творчасць увабрала ў сябе ўнікальную беларускую ментальнасць і працягвае дэманстраваць уласцівую нашаму народу таленавітасць, жыццялюбства. Набывае асаблівы сэнс і культуралагічную каштоўнасць зварот да вытокаў нацыянальнай культуры і адраджэнне ў сучасным культурным жыцці фальклорных узораў народнай творчасці.

Так, у свой час, у мэтах забеспячэння пераемнасці духоўных і мастацкіх традыцый упраўленнем культуры і ўпраўленнем адукацыі Мінскага аблвыканкама была распрацавана абласная праграма «Традыцыйная культура і дзеці на 2006 — 2010 гады. За час дзеяння праграмы ўстановамі культуры Міншчыны быў назапашаны значны вопыт у далучэнні дзяцей і падлеткаў да засваення традыцыйнай мастацкай творчасці беларусаў. Супрацоўнікамі клубных устаноў былі выкарыстаны такія формы працы, як правядзенне фальклорных абрадавых святаў, тэатралізаваных прадстаўленняў, выставак народных промыслаў і рамёстваў, сустрэч з майстрамі, конкурсаў, вечарын, гульнева-забаўляльных праграм, народных гулянняў, кірмашоў. У працэсе рэалізацыі праграмы вялася работа па стварэнні дзіцячых фальклорных калектываў. Каля 1500 дзяцей засвойваюць народныя танцы, гульні, звычаі, знаёмяцца са святамі і абрадамі родных мясцін.

Відавочна, што менавіта сельскія аматарскія калектывы, узнаўляючы каштоўнасці традыцыйнай культуры ў сучасных сацыякультурных умовах, садзейнічаюць мэтам сацыялізацыі асобы, яе сацыяльнаму выхаванню, абапіраючыся на традыцыі беларускага этнасу, што набыў свае асаблівасці, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Эфектыўнай формай падтрымкі аматарскай творчасці з'яўляецца правядзенне абласнымі цэнтрамі народнай творчасці (АЦНТ) фестывальных мерапрыемстваў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія дэманструюць дасягненні, выяўляюць праблемы і тэндэнцыі развіцця народнай творчасці.

Пры непасрэдным удзеле супрацоўнікаў рэалізуюцца фестывалі фальклору, святы народнай творчасці, выставы і кірмашы народных рамёстваў. Асаблівую значнасць і дзяржаўную падтрымку атрымалі фальклорныя святы ў буйных этнарэгіёнах Беларусі: Панямонне, Паазер'е, Прыдняпроўе, Заходнім і Усходнім Палессі, Цэнтральнай Беларусі. Дзякуючы каардынацыйнай дзейнасці абласных цэнтраў народнай творчасці аматарскія калектывы ажыццяўляюць шырокую канцэртна-відовішчную дзейнасць, спрыяюць развіццю мастацкай творчасці.

Метадычнае суправаджэнне дзейнасці калектываў аматарскай мастацкай творчасці, якое ажыццяўляецца спецыялістамі абласных цэнтраў народнай творчасці, дазваляе рэалізаваць значныя арт-праекты. Пад патранатам АЦНТ рэалізуюцца шматлікія фестывальныя акцыі: рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур (Гродна), фестываль сярэднявечнай культуры «Гальшанскі замак» (Ашмянскі раён, Гальшаны) і свята народнай творчасці "Аўгустоўскі канал запрашае сяброў" (Гродзенскі раён) Гродзенскай вобласці, міжнародны фестываль дзіцячай творчасці «Залатая пчолка» (Клімавічы), міжнародны фестываль народнай творчасці "Вянок дружбы", (Бабруйск) і фестываль народнай творчасці, промыслаў і рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" (Дрыбін) Магілёўскай вобласці, міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (Паставы), фестываль сярэднявечнай культуры «Рубон» (Полацк) Віцебскай вобласці, міжнародны фестываль харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод", рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня" (Акцябрскі раён) і Усебеларускі фестываль народнага гумару "Аўцюкі" (Калінкавіцкі раён) Гомельскай вобласці, фестываль народнай творчасці "Напеў зямлі маёй" (Мар'іна Горка) і рэспубліканскі фестываль харавога мастацтва "Пеўчае поле" (Мядзел) Мінскай вобласці, фестываль народнага гумару "Спораўскія жарты" (Бярозаўскі раён) і міжнародны фестываль фальклору "Мотальскія прысмакі" (Іванаўскі раён, аграгарадок Моталь) Брэсцкай вобласці і інш [1].

На мяжы ХХ-ХХІ стст. значна пашырылася карта фестывальных акцый, у якіх прымаюць удзел калектывы розных напрамкаў і жанраў аматарскай творчасці. Фестывалі народнай творчасці адрозніваюцца ўсё большай жанравай разнастайнасцю (музычныя, харэаграфічныя, тэатральныя, дэкаратыўна-прыкладнога і эстраднага мастацтва, фальклору, праваслаўнай культуры, інклюзіўнай творчасці, ветэранскіх калектываў, дзіцячыя і іншыя). Дзякуючы фестывальным акцыям у сферы народнай творчасці ствараюцца перадумовы стварэння нацыянальна-культурных брэндаў і фарміруецца імідж Беларусі [1].

Вялікае значэнне для стварэння тэарэтычнага падмурку для функцыянавання аматарскіх калектываў, заарыентаваных на фальклоныя традыцыі, а таксама фестывальнай дзейнасці ў гэтым кірунку мела далучэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыялістаў з добрым практычным вопытам і ведамі, дзякуючы якім на новым узроўні адбываюцца асэнсаванне і прафесійнае вывучэнне нацыянальных фальклорных традыцый, узнаўленне іх у сучаснай фестывальнай практыцы. Дзякуючы намаганням вядомых беларускіх даследчыкаў, такіх як Т.Варфаламеева, М.Дрыневскі, М.Козенка, В.Ліцвінка і інш, у прыватнасці, рэгіянальныя фестывалі фальклору набылі навуковы характар і рэалізуюцца ў форме комплексных доўгатэрміновых праграм.

Арыентацыя на захаванне культурных каштоўнасцей традыцыйнай культуры, якая існуе ў дзейнасці пэўнай колькасці аматарскіх калектываў, выклікае неабходнасць больш беражлівых адносін да праяў народнай культуры з боку кіраўнікоў мастацкіх калектываў. У прыватнасці, дзейнасць некаторых фальклорных калектываў, маючых ганаровае найменне “народны” і “узорны” у большай ступені адлюстроўвае растыражыраванныя ўзоры беларускай народнай песні, і ў меньшай ступені, спрыяе захаванню мясцовых рэгіянальных этнатрадыцый.

Між тым, працэс узнаўлення фальклорных традыцый у дзейнасці большасці канцэртных калектываў мае пераважна станоўчыя прыкметы. Беларускія народныя песні, наігрышы, інструментальныя творы, заснаваныя на фальклорных традыцыях, прадстаўлены ў канцэртных праграмах практычна кожнага раёна вобласці. Таленавітыя музыкі ўзбагачаюць новымі рысамі і гранямі традыцыйныя ўзоры беларускай музыкі, захоўваючы пры гэтым іх каларыт і непаўторнасць.

Патрабуюцца інтэлектуальныя намаганні спецыялістаў розных гуманітарных
навук для вызначэння ролі фестываляў народнай мастацкай творчасці ў працэсе адраджэння і падтрымкі традыцыйнай народнай культуры, захаванні і прапагандзе гісторыка-культурнай спадчыны, выяўленні характару іх уплыву на культурнае жыццё розных рэгіёнаў Беларусі.

Сапраўды, аматарская творчасць у рэгіёнах Беларусі – унікальная сацыяльна-культурная з'ява, з мнагатыпнай і шматфункцыянальнай структурай, якая валодае характарыстыкамі, уласцівымі сацыяльна-культурнай дзейнасці, і каштоўнасцямі мастацкай культуры. Яна складаецца з мноства мастацкіх падсістэм, звязаных з выдзяленнем розных відаў, кірункаў і жанраў; фальклору і мастацтва, фольклорнай і постфальклорнай творчасці, эстэтычных і ўтылітарна-мастацкіх фенаменаў, традыцыйнага і інавацыйнага мастацтваў.

У межах аматарскай дзейнасці адбываецца паралельнае развіццё творчых кірункаў, відаў і жанраў на аснове розных традыцый і ў сувязі з рознымі ўзроўнямі культуры (мастацка-прафесійнай, бытавой, класічнай, фальклорнай, масавай, элітарнай, авангарднай культуры і інш.).

Адначасова яна з'яўляецца дзейснай сацыяльна-педагагічнай сістэмай, бо мае значны выхаваўчы патэнцыял, у ёй арганічна спалучаюцца культурна-адукацыйныя і крэатыўныя тэхналогіі, індывідуальны і калектыўны пачатак, арганізацыйныя і выхаваўчыя падыходы. Аматарская мастацкая творчасць Беларусі на працягу дзесяцігоддзяў актыўна спрыяе інкультурацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і сацыялізацыі асобы сродкамі мастацтва.

Назіранне за станам развіцця аматарскай мастацкай творчасці, улік сацыяльна-эканамічных, псіхолага-педагагічных, этнаканфесіянальных і іншых фактараў, якія ўздзейнічаюць на фарміраванне культурных ініцыятыў, навуковы аналіз гэтых працэсаў з’яўляюцца сёння неабходным этапам працэсу дзяржаўнага рэгулявання ў сацыякультурнай сферы. Асэнсаванне ўсіх аспектаў функцыяніравання аматарскай мастацкай творчасці ў нашым грамадстве павінна адбывацца з агульнафіласофскіх, культуралагічных і мастацтвазнаўчых пазіцый. Для гэтага неабходна прыцягненне шырокага кола спецыялістаў з ліку культуролагаў, мастацтвазнаўцаў, сацыёлагаў, эканамістаў і інш.

Такім чынам, аматарская мастацкая творчасць як спецыяльна арганізаваная дзейнасць па засваенні, стварэнні і распаўсюджванні культурна-эстэтычных каштоўнасцей ва ўмовах вольнага часу не губляе сваёй надзённасці і актуальнасці. Як з’ява беларускай нацыянальнай культуры, сучасная аматарская мастацкая творчасць праз зварот да этнарэгіянальных традыцый і звычаяў беларускага, а таксама і іншых народаў Беларусі набывае новы якасны ўзровень і эстэтычную значнасць.

Выклікае заклапочанасць той факт, што практыка развіцця аматарскай мастацкай творчасці, якая апераджальна развіваецца ў апошнія дзесяцігоддзі, недастаткова актыўна асэнсоўваецца з боку гісторыкаў, культуролагаў, сацыёлагаў, эканамістаў. Належыць канстатаваць, што пакуль не атрымалі належнай распрацоўкі культуралагічныя, сацыяльна-педагагічныя і тэхналагічныя аспекты дадзенай грамадска-культурнай з’явы. У шэрагу надзённых праблем – своечасовае тэарэтыка-метадалагічнае асэнсаванне пазначанага пласта сацыяльна-культурнай практыкі.

Патрабуецца больш разгорнутае навукова-тэарэтычнае асэнсаванне тых з'яў, што адбываюцца ў аматарскай мастацкай творчасці ў розных рэгіёнах краіны. Бачыцца неабходным правядзенне спецыяльных сацыялагічных даследаванняў па праблемах бытавання самых розных відаў і жанраў аматарскай творчасці; пытаннях арганізацыі канцэртна-творчай дзейнасці, падрыхтоукі кадраў і інфармацыйна-метадычнай падтрымкі аматарскай творчасці, распрацоўкі фестывальных тэхналогій; праблемах рэпертуару і інш. Неабходна пашырэнне кола навуковых тэм і даследаванняў, прысвечаных сацыякультурнаму жыццю розных рэгіёнаў краіны і выяўленню дынамікі развіцця аматарскай мастацкай творчасці як сродка грамадскага выхавання асобы.

**Літаратура**

1. Беларуская культура – 2016 : стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця / Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ДУА «Інстытут культуры Беларусі» ; уклад. : А. Р. Гуляева, І. Б. Лапцёнак ; рэдкал. : Б. У. Святлоў (старш.) [і інш.]. — Мінск : Інбелкульт, 2017. — 310 с.

УДК 78:004



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ